# Водгук «з белымі плямамі»

**Н. Д. Смарцэлава,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 1 г. Жлобіна

Водгук як від творчай работы дэманструе сфарміраванасць у вучня камунікатыўнай кампетэнцыі і характарызуецца сур'ёзнымі патрабаваннямі да яго ведаў і ўменняў. Пачынаючы працаваць з водгукам, вучань павіне:

- ✓ ведаць літаратуразнаўчыя паняцці (сюжэт, кампазіцыя, выяўленчыя сродкі выразнасці і інш.) і ўмець вызначаць іх ролю ў літаратурным творы, інтэрпрэтаваць іх;
- ✓ быць дасведчаным у біяграфіі аўтара і ўмець суадносіць факты яго жыцця з матэрыялам твора;
- ✓ быць інфармаваным пра блізкія па тэматыцы творы аўтара, а таксама іншых майстроў слова і прадстаўнікоў іншых відаў мастацтва;
- ✓ ведаць правілы пабудовы тэксту;
- ✓ валодаць культурай маўлення.

Пры гэтым у вучня павінна быць добра развітая эмацыянальная сфера, што дазволіць яму разважаць пра пачуцці і перажыванні героя твора, суадносіць прачытанае з уласным жыццёвым вопытам.

Улічваючы высокі ўзровень патрабаванняў да ведаў і ўменняў вучняў, прыйшла да высновы, што работу над водгукам трэба арганізоўваць паэтапна. Гэта дасць магчымасць стварыць усе ўмовы для напісання гэтага творчай работы, пазбегнуць сітуацыі расчаравання і нежадання вучня працаваць творча.

У маёй сістэме работы над водгукам станоўчыя вынікі дае работа з водгукам "з белымі плямамі". Гэта форма работы дапамагае вучням звярнуць увагу на самыя значныя моманты тэксту, не прапусціць нічога істотнага, мець у выніку работы водгук, напісаны з улікам усіх патрабаванняў. Разам з тым водгук "з белымі плямамі" не абмяжоўвае творчасць вучня: ён накіроўвае яго ў час творчай працы, з мастацкім тэкстам.

Абавязковым элементам водгуку на вершаваны твор з'яўляецца аналіз асобы лірычнага героя. Пры вывучэнні лірычных твораў на ўроках беларускай літаратуры ў восьмым класе, аналізуючы асобу лірычнага героя, заўсёды прапаноўваю вучням наступныя заданні:

*Ахарактарызуйце лірычнага героя верша, карыстаючыся словамі для даведак:*

1. Лірычны герой верша Рыгора Барадуліна “Трэба дома бываць часцей” – чалавек, які нарадзіўся ў ___________, пранёс пачуццё _______________ тым людзям, якія вывелі яго на _________________ дарогу, што пачалася са ________________ ад хаты _____________.

*Словы для даведак: бацькі, вёска, удзячнасць, жыццёвы, сцежка.*

2. Лірычны герой верша Петруся Броўкі «Пахне чабор» – гэта сталы чалавек, які звяртаецца ва _____________ да юнацкага кахання, калі праз сваю _______________ не змог выйсці да каханай ______________ і прызнацца ў пачуццях; з таго часу ён дакарае сам сябе, і кожны раз яго агортвае светлы ___________, калі чуецца пах _________.

*Словы для даведак: смутак, нясмеласць, чабор, дзяўчына, успаміны.*

3. Лірычны герой верша Янкі Купалы «Спадчына» – _____________, _______ якога непарыўна звязаны з лёсам _________; ён шчыра любіць свой __________і трывожыцца за яго ________________ .

*Словы для даведак: край, будучыня, патрыёт, лёс, Радзіма.*

Падобныя заданні накіраваны не толькі на фарміраванне ўменне аналізаваць асобу лірычнага героя, але и на развіццё маўлення вучняў.

Аналізуючы паэтычныя тропы, ужытыя ў вершах, вучні таксама звычайна працуюць з заданнямі “з белымі плямамі”:

*Прааналізуйце мову вершаў, карыстаючыся словамі для даведак.*

1) Мова верша Генадзя Пашкова “Пазвоніць аднойчы вясна…” вызначаецца наяўнасцю паэтычных тропаў, якія робяць яе выразнай і запамінальнай. Так, метафара ў вершаваным радку (1)“_____________” падкрэслівае жыватворныя сілы вясны і яе актыўнасць. Шматлікія эпітэты ((2)“________”, (3)”_______”, (4)“_______” і іншыя) вельмі вобразна передаюць малюнак вясенняга пейзажу. Асаблівы сэнс надаецца паэтам радку (5)“_____________”, у якім мы назіраем гіпербалу. Праз яе аўтар падкрэслівае магутныя сілы прыроды, што так доўга чакала вясну.

*Словы для даведак:* “сонечны пух”; “…дзе рвецца да сонца з-пад рук // з пластоў чарназёмных травіна”; “Пазвоніць аднойчы вясна // празрыстым званком ручаіны”, “гарэзны раўчук”; “развеснены шпак”.

2) Характарызуючы мову верша Петруся Броўкі “Пахне чабор”, нельга не адзначыць паэтычныя тропы, ужытыя аўтарам. Больш за ўсё ў вершы ўражвае (1)______________, якое заўважаем у вершаваным радку “Сонца за борам жар-птушкай садзіцца…”. Дзякуючы яму верш набывае атмасферу казачнасці і таямнічасці. У радку “Штосьці спявае пяшчотнае

бор…” заўважаем (2)__________, праз якую нежывы бор падаецца паэтам як жывая істота. Запамінальныя (3)__________, якімі насычаны верш (“лёгкія крокі”, “блізкае, яснае шчасце”, “маўклівы прастор”) перадаюць пачуцці героя і адначасова ствараюць пейзажны малюнак.

*Словы для даведак:* эпітэт, метафара, параўнанне.

3) Урывак з паэмы Якуба Коласа “Сымон-музыка” “О, край родны, край прыгожы…” надзвычай багаты на вершаваныя тропы. Дзякуючы ўдала ўжытым словам, якія набываюць у творы пераносны сэнс, чытач максімальна адчувае на сабе ўздзеянне паэтычнага слова. Твор нарадзіў агульнавядомую перыфразу (1)“______________”, якая зараз часта замяняе словы Беларусь, Бацькаўшчына, Айчына. Нельга не заўважыць метафарычнасць мовы вершаванага ўрыўка. Напрыклад, у радку (2)“____________”, Колас надзяляе аб’ект прыроды рысамі жывой істоты. Параўнанне, створанае паэтам у радку (3)“____________”, дазваляе чытачу лепш уявіць рачныя прасторы роднай краіны. Эпітэты (напрыклад, (4)“_____________”) ствараюць запамінальны малюнак прыроды. Менавіта арыгінальнасць і непаўторнасць створаных мовай паэта вобразаў і зрабілі гэты твор адным з самых вядомых у класічнай беларускай паэзіі.

*Словы для даведак:* “Нівы гутаркі вядуць”; “Дзе бруяцца срэбрам рэчкі”; “Мілы кут маіх дзядоў”; “светлыя берагі”.

Пазней пры вывучэнні верша Аркадзя Куляшова “Бывай…” прапаноўваю васьмікласнікам стварыць водгук на гэты верш, запаўняючы “белыя плямы”.

**Водгук на верш Аркадзя Куляшова “Бывай…”**

У беларускай літаратуры ёсць творы, якім лёсам наканавана неўміручасць. Адна згадка пра іх выклікае шчырыя пачуцці, цёплыя ўспаміны і вялікі гонар за талент пісьменнікаў-землякоў. Да такіх твораў нельга не аднесці верш Аркадзя Куляшова “Бывай…”.

Ужо назва твора перадае чытачу агульны настрой верша – (1)_____________ ад растання з каханай дзяўчынай. Таму жанр верша можна вызначыць як (2)___________, бо гэта верш-(3)_________, у якім выяўляецца настрой смутку, журбы, меланхоліі. Верш, несумненна, належыць да (4)__________ лірыкі. Да вершаў з падобнай атмасферай належаць творы (5)“__________” _________ і (6)“_________” _________.

Лірычны герой верша – гэта (7)_________, жыццёвы шлях якога толькі пачынаецца, што бачна па радку (8)“_________”. Гэты малады чалавек здольны не толькі перажываць трапяткое і чыстае пачуццё. Ён здольны суадносіць свой унутраны свет са станам (9)___________, і гэта чытаецца ў

наступных радках: (10)“____________”, (11)“____________”, (12)“____________”.

Кампазіцыйна верш можна падзяліць на (13)_________ часткі ў адпаведнасці з колькасцю (14)________. Усе яны маюць па (15)___________ радкі. З кожнай часткай узмацняецца смутак лірычнага героя: шкадаванне, адчай, боль і горыч, плач. Вершаваны памер – (16)_____________ . У вершы заўважаецца вялікая даўжыня (17)____________, якая садзейнічае перадачы запаволенасці, плаўнасці думкі, стварае статычны малюнак.

З паэтычных тропаў у творы пераважаюць (18)____________. З іх дапамогай апісваецца ці сама Алеся ((19)“_____________”, (20)“____________”), ці настрой і пачуцці лірычнага героя ((21)“_____________”, (22)“____________”, (23)“____________”). Параўнанне ((24)“_____________”) надае вершу вобразнасць і маляўнічасць. Метафары ((25)“____________”, (26)“____________”, (27)“_____________”) спрыяюць перадачы моцнага пачуцця юнака.

Сінтаксіс верша ўражвае сваёй разнастайнасцю. Простыя сказы тут ускладненыя звароткамі ((28)“_____________”), аднароднымі членамі сказа ((29)“_____________”), адасобленай акалічнасцю ((30)“______________”). Сярод складаных сказаў можна вызначыць як складаназлучаныя ((31)“______________”), так і складаназалежныя ((32)“______________”).

Аўтар выкарыстоўвае (33)___________ і (34)__________ сказы, што сведчыць аб спакойнасці і роўнасці яго пачуцця. Двойчы ў тэксце ўжываецца (35)______________: герой ў стане роздуму, яго думкі яшчэ не цалкам паказаныя ў вершаваных радках твора.

Пачуццё светлага смутку, якое дорыць гэты верш, узмацняецца пасля таго, як праслухаеш песню (36)“________________” ў выкананні ансамбля (37)“________________”, музыку да якой напісаў (38)__________________. Па тэксце верш і песня (39)_______________, але іх аб’ядноўваюць агульны настрой і радасць за юнака, якому пашчасціла перажыць такое моцнае пачуццё – першае каханне, хай і не ўзаемнае.

Як бы хацелася, каб маладыя людзі, хлопцы і дзяўчаты, спаткаўшы сваё першае каханне, змаглі так жа годна сустрэць яго і перажыць, як здолелі гэта лірычны герой верша “Бывай…” ды і сам Аркадзь Куляшоў.

**Словы для даведак:**

1. смутак
2. элегію
3. роздум
4. інтымнай
5. “Пахне чабор” Петруся Броўкі

6. “Раманс” Максіма Багдановіча
7. юнак
8. “На ўсходзе дня майго, якому ружавець”
9. прыроды
10. “Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае…”
11. “Над намі жаўранкам звінеў і плакаў май”
12. “Назаўтра золкае туманнае світанне…”
13. чатыры
14. строф
15. чатыры
16. шасцістопны ямб
17. вершаванага радка
18. эпітэты
19. “абуджаная сэрцам”
20. “смуглявая, каханая”
21. “нямы адчай”
22. “першае нясмелае прызнанне”
23. “самотным жаўранкам”
24. “жаўранкам звінеў і плакаў май”
25. “Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае”
26. “Палынны жаль смугой ахутаных дарог”
27. “Самотным жаўранкам звініць і плача май…”
28. “Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся.”
29. “Назаўтра золкае, туманнае світанне, суровы позірк твой і мой нямы адчай… ”
30. “Пайшла, пакінуўшы мне золкі і туманны, палынны жаль смугой ахутаных дарог…”
31. “Стаю на ростанях былых, а з паднябесся самотным жаўранкам звініць і плача май…”
32. “Чаму так горка, не магу я зразумець.”
33. апавядальныя
34. пытальныя
35. шматкроп’е
36. “Алеся”
37. “Песняры”
38. Ігар Лучанок
39. адрозніваюцца

Варыянтаў работы з водгукам “з белымі плямамі” можа быць некалькі. Яго можна прапанаваць вучням у якасці індывідуальнай работы, а таксама

як парную ці групавую работу. Калі вучні добра падрыхтаваныя да такога віду работы, то яны могуць працаваць толькі з тэкстам верша і дадатковай інфармацыяй у падручніку. У адваротным выпадку я прапаноўваю ім словы для даведак.

Калі вучні працуюць над аналізам верша ў групах, вынікам іх работы таксама можа стаць водгук. Для гэтага часткі водгука “з белымі плямамі” размяркоўваюцца паміж групамі. Запоўніўшы “белыя плямы” і аб’яднаўшы часткі ў патрэбнай паслядоўнасці, вучні атрымліваюць водгук.

Напрыклад, аналізуючы верш Максіма Багдановіча “Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…”, прапаноўваю вучням аб’яднацца ў тры групы і працаваць па сваіх тэмах:

- ✓ ідэйны змест верша;
- ✓ паэтычныя тропы;
- ✓ гукапіс.

Вучням з высокім узроўнем вучэбных дасягненняў прапаноўваю самастойна стварыць пачатак і заключэнне водгуку, абапіраючыся на матэрыялы, з якімі працуюць групы.

**Заданне для першай групы.**

Верш Максіма Багдановіча “Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…” належыць да (1)______________ лірыкі, бо ён перадае пачуцці і ўражанні, выкліканыя малюнкамі і з’явамі (2)____________ . Малюнак позняга летняга вечара, створаны ў вершы, мы бачым вачыма лірычнага героя. Лірычны герой гэтага верша – гэта (3)____________, якога (4)_____ заспела ў (5)___________; ён адчувае сябе часткай прыроды і назірае за яе начным (6)___________.

*Словы для даведак:* жыццё, вандроўнік, пейзажны, ноч, дарога, прырода.

**Заданне для другой групы.**

Мова верша “Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…” вобразная, выразная. Паэту ўдалося падкрэсліць усе непаўторныя рысы з’яў і прадметаў. Гэта стала магчыма дзякуючы ўмеламу выкарыстанню Багдановічам паэтычных тропаў. У радках “Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы сог, // Улажылі спаць мяне вы на зямлі” мы заўважаем (1)__________, якая выконвае функцыю замяшчэння нежывога жывым. У вершы прысутнічаюць вобразныя азначэнні – (2)___________ (“агністаю слязой”, “бледны рог”, “светлы пыл”), якія ўдакладняюць уяўленні чытача пра аб’екты прыроды. Непаўторны эфект стварае (3)____________ “Знічка коціцца агністаю слязой”: малюнак знічкі ствараецца праз супастаўленне са слязой. Верш заканчваецца неверагодна

прыгожай (4)___________ “Чую ў цішы, як расце трава”, праз якую Максім Багдановіч падкрэслівае казачную цішыню гэтай летняй ночы.

*Словы для даведак:* эпітэт, гіпербала, параўнанне, метафара.

**Заданне для трэцяй групы.**

Дадатковы эфект атмасферы летняй ночы ствараецца паэтам праз гукапіс. Багдановіч удала спалучае словы з пэўнымі гукамі, у выніку чаго чытач адчувае сябе на ўлонні прыроды, сярод прыгожых краявідаў. У вершаваным радку (1)”___________” заўважаецца спалучэнне санорных гукаў [ў], [н], [м], [р], [л], якім аўтар перадае плаўнасць, павольнасць з’яўлення месяца на небе. У радку (2)”___________” пры дапамозе дрыжачага гука [р] падкрэсліваецца і ўзмацняецца эфект дрыжання зорак у начным небе. Свісцячыя гукі [з], [ц], [с] спрыяюць перадачы гукаў пры падзенні знічкі ((3)”_____________”). Гукі крылаў савы ў вершаваным радку (4)”_____________” удакладняюцца праз спалучэнне глухіх [п], [к], шыпячага [ш] і свісцячага [с]. Такое ўдалае спалучэнне гукаў у вершы дазваляе сцвярджаць, што Максім Багдановіч – сапраўдны майстар гукапісу.

*Словы для даведак:* “Прашумела мякка скрыдламі сава...”; “Знічка коціцца агністаю слязой…”; “Ў небе месяца праглянуў бледны рог…”; “Як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной…”.

Пасля выканання заданняў усімі групамі навучэнцаў часткі водгуку аб’ядноўваюцца ў адзінае цэлае, чытаюцца ў патрэбнай паслядоўнасці.

Работу з водгукам “з белымі плямамі” пачынаю ўжо ў пятым класе, калі вучні ствараюць свае першыя міні-водгукі. Пры разглядзе верша Анатоля Грачанікава “Верасень” прапаноўваю вучням запоўніць “белыя плямы” ў водгуку на кантрольна-ацэначным этапе ўрока.

**Міні-водгук на верш Анатоля Грачанікава “Верасень”**

У творчасці беларускіх паэтаў адной з вядучых тэм з’яўляецца тэма (1)___________ . Ёй прысвечаны вершы “Зімой” Максіма Багдановіча, “Лісце” Уладзіміра Караткевіча, “Як ападае ліст” Анатоля Грачанікава і інш. Апісанню хараства прыроды ў пачатку (2)___________ прысвяціў свой верш “Верасень” Анатоль Грачанікаў.

Уявіць хараство і багацце прыроды нам дапамагаюць створаныя аўтарам (3)______________: “звонкія павуціны”, “ацяжэлыя гронкі”, “сцішаны палёт”, “лагодна-мяккі свет” і інш. Адчуць адносіны аўтара да восеньскай прыроды магчыма пры дапамозе (4)____________ : “прасвечаны святлом яго, як гронка”, “свет, нібы вашчына”.

Чытаючы гэты верш, заўважаеш, што ён прасякнуты пачуццём (5)___________ да роднай зямлі, да сваёй Айчыны.

*Словы для даведак*: любоў, прырода, параўнанне, восень, эпітэт.

Пры вывучэнні новых паняццяў і тэрмінаў водгук паступова разгортваецца, набывае выгляд сапраўднай творчай работы. І калі на ўроку беларускай мовы па тэме “Водгук на празаічны або вершаваны твор” ў восьмым класе адбываецца грунтоўнае знаёмства з гэтым відам дзейнасці, вучні здольныя рухацца ў правільным кірунку і ствараць водгук ужо без тэксту-апоры.

**Літаратура**

1. Карухіна, В. А. Урокі беларускай літаратуры ў 8 класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з беларус. і рус. мовамі навучання / В. А. Карухіна, П. І. Лявонава, І. М. Слесарава. – Мінск: Маст. літ., 2006. – 214 с.
2. Праскаловіч, В. У. Алімпіяды па беларускай мове і літаратуры: Водгук на мастацкі твор. Вуснае выказванне / В. У. Праскаловіч і інш. – Мінск: Бел. асац. “Конкурс”, 2020. – 272 с.
3. Рагойша, В. П. Верш. Паэзія: энцыклапедычны даведнік / В. П. Рагойша. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2020. – 472 с.